# ТВОРЧЫЯ САЮЗЫ ЯК ВІД ГРАМАДСКІХ АБ'ЯДНАННЯЎ ПАВОДЛЕ ЗАКАНАДАЎСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*А.Л. Дашкевіч, ІКП*

Распад СССР, утварэнне і развіццё Рэспублікі Беларусь адбывалася ў кантэксце радыкальных грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. У гэтых умовах ішоў працэс пераасэнсавання ролі грамадскіх аб'яднанняў, якія пачынаюць успрымацца не ў якасці сваеасаблівага "працягу" дзяржаўнага механізму, а як праява і фактар фарміравання грамадзянскай супольнасці. Гэта тычыцца і творчых саюзаў. На сёння ў Беларусі зарэгістравана 40 такіх аб'яднанняў [1].

Важнейшым нарматыўным прававым актам, які рэгулюе дзейнасць творчых саюзаў з'яўляецца Закон "Аб творчых саюзах і творчых работніках" ад 16 снежня 1999 г. У гэтым дакуменце замацоўваецца, што творчыя саюзы ўяўляюць сабой грамадскія аб'яднанні творчых работнікаў, якія сваімі дасягненнямі ўнеслі ўклад у развіццё культуры, мастацтва і іншай культурнай творчай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, створаныя ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку на аснове агульнасці інтарэсаў яго членаў (удзельнікаў) у пэўным відзе творчай дзейнасці для задавальнення іх духоўных або іншых нематэрыяльных патрэб [2, арт. 1]. Неабходна вызначыць, ці гэта від грамадскіх аб'яднанняў у шырокім або ў вузкім сэнсе (паводле Закона "Аб грамадскіх аб'яднаннях" ад 4 кастрычніка 1994 г.)*, што мае і практычнае значэнне, бо дае адказ на пытанне аб прымяненні да творчых саюзаў нормаў вышэй указанага закону і іншых актаў заканадаўства прынятых на яго падставе.

У арт. 1 Закона "Аб грамадскіх аб'яднаннях" указваецца, што яго дзеянне не распаўсюджваецца на палітычныя партыі, прафесійныя саюзы, рэлігійныя арганізацыі, іх саюзы (асацыяцыі), рэспубліканскія дзяржаўна-грамадскія аб'яднанні, органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, іншыя грамадскія фарміраванні, парадак стварэння і дзейнасць якіх устанаўліваецца адпаведнымі заканадаўчымі актамі [3]. У адносінах да парадку стварэння і дзейнасці творчых саюзаў ёсць спецыяльны заканадаўчы акт (Закон "Аб творчых саюзах і творчых работніках"). Адпаведна, на першы погляд, атрымліваецца, што Закон "Аб грамадскіх аб'яднаннях" не павінен распаўсюджваць сваё дзеянне на гэты від грамадскіх аб'яднанняў.

Аднак у Законе "Аб творчых саюзах і творчых работніках" дакладна не вызначана працэдура стварэння і рэгістрацыі творчага саюза, а замацавана адсылачная норма – "стварэнне і рэгістрацыя творчых саюзаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь" (арт. 9). У законе прысутнічаюць і іншыя адсылачныя нормы такога ж характару. З гэтага вынікае,

---

* Падрабязней аб ужыванні паняцця "грамадскае аб'яднанне" ў межах беларускага заканадаўства гл.: Дашкевіч А.Л. Выкарыстанне паняцця "грамадскае аб'яднанне" ў сучасным заканадаўстве Беларусі // Проблемы борьбы с преступностью и подготовки кадров для внутренних дел Республики Беларусь: Тезисы докладов Международной научно-практической конференции посвящённой Дню белорусской науки (Минск, 25 января 2008 г.) / Министерство внутренних дел Республики Беларусь, Академия МВД. – Мн.: Академия МВД Республики Беларусь, 2008. – С.26 - 27.

што Закон “Аб грамадскіх аб’яднаннях” павінен прымяняцца адносна творчых саюзаў у той частцы, якая не супярэчыць спецыяльнаму закону. На гэта ўказвае і практыка дзейнасці Міністэрства юстыцыі пры рэгістрацыі творчых саюзаў, якое кіруецца ў тым ліку палажэннямі Закона “Аб грамадскіх аб’яднаннях”.

Такім чынам, паводле беларускага заканадаўства творчыя саюзы выступаюць у якасці віду грамадскіх аб’яднанняў (у вузкім сэнсе) для рэгулявання дзейнасці якіх, разам са спецыяльнымі актамі, прымяняецца Закон “Аб грамадскіх аб’яднаннях” і іншыя акты, прынятыя на падставе апошняга.

Літаратура:


1. Сведения о зарегистрированных за 2007 год, а также действующих в настоящее время политических партиях и иных общественных объединениях [Электронный ресурс]. – Минск, 28 января 2008 г. – Режим доступа: http://www.minjust.by/ru/site_menu/news?id=130.
2. Аб творчых саюзах і творчых работніках: Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 снежня 1999 г. // Звязда. – 1999. - №250.
3. Об общественных объединениях: Закон Республики Беларусь от 4 октября 1994 г.; в редакции Закона от 19 июля 2005 г. // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь.